Падтрымай "Вясну" на PATREON

Свіслацкі суд пакараў Уладзіміра Хільмановіча штрафам у 40 базавых велічынь

08.12.2015 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, праваабаронцы, свабода мірных сходаў



8 снежня ў Свіслацкім раённым судзе адбыўся разгляд справы гродзенскага праваабаронцы Уладзіміра Хільмановіча па абвінавачанні ва ўдзеле ў несанкцыянаваных мітынгу і шэсці. Менавіта так было кваліфікавана мясцовай міліцыяй ушанаванне у гэтым раённым цэнтры памяці паўстанцаў 1863-га года і ўсіх палеглых за Беларусь, што адбылося 31-га кастрычніка.

На самым пачатку працэсу, які вяла суддзя Жана Салагубік, Уладзімір Хільмановіч заявіў некалькі хадайніцтваў і звярнуў увагу на тое, што ідзе ўжо не першы аналагічны судовы працэс над удзельнікамі Дня памяці, ёсць асуджаныя да штрафаў, але самога факту правядзення мітынгу і шэсця суд юрыдычна так і не даказаў. У ходзе самога працэсу Хільмановіч неаднаразова задаваў пытанні на гэтую тэму сведкам, якімі былі тыя самыя супрацоўнікі міліцыі, што складалі пратакол, але ніхто з іх так і не змог растлумачыць, чаму дадзеная мемарыяльная акцыя падпадае пад вызначэнне мітынгу і шэсця, а не з'яўляецца наведваннем у знакавы памятны дзень магілаў славутых продкаў і памятных мясцін, звязаных з паўстаннем.

Таксама ніхто са сведкаў-міліцыянтаў не змог растлумачыць, якімі нарматыўнымі дакументамі яны кіраваліся, калі сцвярджалі, што трыманне ў руках бел-чырвона-белага сцяга ёсць парушэннем заканадаўства.

Хільмановіч звярнуў увагу суддзі і на тое, што фактычна паказанні сведкаў былі на яго карысць і пацвердзілі яго словы пра тое, што ён нічым не парушыў заканадаўства. І тое, што міліцыя ні разу за час правядзення мерапрыемства не папярэдзіла прысутных пра парушэнне заканадаўства, даказвае, што так яно і было насамрэч.

І хоць на пытанні Уладзіміра Хільмановіча, ці быў ціск на міліцыю зверху, каб тыя складалі пратаколы, самі яны адказвалі што не, ніхто з іх так і не давёў іншай версіі ўзнікнення гэтых пратаколаў. Хільмановіч таксама спасылаўся на непісьменныя з юрыдычнага гледзішча рапарты міліцыянтаў, якія фігуравалі ў справе, а таксама іншыя недарэчнасці матэрыялаў справы.

Уладзімір Хільмановіч спасылаўся на канкрэтныя артыкулы заканадаўства – Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона аб правядзенні масавых мерапрыемстваў, Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, а таксама апеляваў да таго, што ён аспрэчвае пакаранне за мінулагодняе аналагічнае пакаранне ў Камітэце па правах чалавека ААН.

Прысутных у залі суда праваабаронцаў і журналістаў вельмі здзівіла тое, што пасля выказвання ўсіх гэтых і іншых довадаў, пасля заканчэння прамовы Хільмановіча суддзі не спатрэбілася аніводнай хвіліны на абдумванне. Суддзя Жана Салагубік спешна агучыла рашэнне – 40 базавых велічынь штрафу і пакінула залу судовых паседжанняў.

Уладзімір Хільмановіч напісаў заяву, каб яму выдалі копію рашэння суда разам з матывіровачнай часткай, каб абскардзіць ў судзе касацыйнай інстанцыі. У выпадку адмоўнага рашэння праваабаронца і гэтым разам збіраецца давесці справу да разгляду ў КПЧ.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY